Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
____________ Ю. П. Бондар
«_____» ______________ 2014 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ______/баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭОРЫЯ, ГІСТОРЫЯ І ПРАКТЫКА МІЖНАРОДНЫХ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ

*Праграма дзяржаўнага экзамену па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), спецыялізацыі 1-21 04 01-02 02 Менеджмент міжнародных культурных сувязей*

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
*А. У. Марозаў,* загадчык кафедры міжкультурных камунікацый, доктар філалагічных навук, прафесар;
*А. І. Сцепанцоў,* загадчык кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*У. В. Кузьмінаў,* дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*К. І. Рэмішэўскі,* дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*Ю. У. Міцкевіч,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый, кандыдат педагагічных навук;
*Т. В. Карнажыцкая,* дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*М. М. Каралёў,* прафесар кафедры міжкультурных камунікацый, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*А. У. Пазнякоў,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;
*У. Ф. Мартынаў,* загадчык кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 25.09.2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №1 ад 10.10.2013 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Ю. У. Міцкевіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен з'яўляецца формай выніковай атэстацыі студэнтаў і праводзіцца для выяўлення адпаведнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў патрабаванням адукацыйнага стандарту пры завяршэнні асваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), спецыялізацыі 1-21 04 01-02 02 Менеджмент міжнародных культурных сувязей.

Дзяржаўны экзамен носіць інтэграваны характар і ўключае вучэбны матэрыял дзвюх вучэбных дысцыплін «Гісторыя і тэорыя міжнародных культурных сувязей» і «Практыка міжнародных культурных сувязей».

*Галоўная мэта* дзяржаўнага экзамену – выяўленне ў выпускнікоў трывалых прафесійных арыентацый для працы ва ўстановах культуры, ведаў і ўменняў арганізацыі камунікатыўнай сістэмы міжнародных культурных сувязей у сучасных сацыяльна-культурных умовах. Для рэалізацыі абазначанай вышэй мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных *задач:*

1) засваенне выпускнікамі ідэй менеджменту як навукі кіравання вытворчымі адносінамі па аднаўленні, захаванні, папулярызацыі і распаўсюджванні культурных каштоўнасцей;

2) авалоданне тэарэтычнымі асновамі эфектыўнага кіравання арганізацыямі культуры розных тыпаў;

3) разуменне структуры распрацоўкі культурных праграм рознага профілю і ўзроўню, прынцыпаў фарміравання прафесійных і аматарскіх калектываў і каманд;

4) авалоданне тэрміналогіяй прыкладной культуралогіі, міжкультурнай камунікацыі, тэорыі кіравання, навыкамі творчага канструявання карэктных азначэнняў для выкарыстоўвання ў міжкультурнай практыцы.

Для вырашэння вышэйпералічаных задач выпускнік павінен *ведаць:*

1) асновы прыкладной культуралогіі, якія дазваляюць выкарыстоўваць заканамернасці працэсу далучэння чалавека да культурнага соцыуму ў спецыфічных умовах рэгіёна пэўнай установы культуры, арганізацыі, сям'і;

2) прынцыпы арганізацыі і эканомікі ўстаноў культуры для ажыццяўлення эфектыўнага кіравання іх дзейнасцю ў рэальных умовах іх функцыянавання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

1) фарміраваць у насельніцтва палітычную, прававую, экалагічную, маральна-этычную, эстэтычную, фізічную культуру;

2) прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць выхаваўчую, мастацка-творчую, арганізацыйна-метадычную, рэкламную функцыі ўстаноў культуры;

3) вывучаць, назапашваць і распаўсюджваць станоўчы вопыт сацыяльна-культурнай дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў, устаноў культуры, грамадскіх арганізацый;

4) праектаваць сацыяльна-культурныя працэсы, распрацоўваць і рэалізоўваць міжкультурныя праекты і праграмы (праектна-менеджарскае майстэрства).

Пры адказе на дзяржаўным экзамене выпускнік павінен прадэманстраваць добрае валоданне прафесійнай лексікай, тэрміналогіяй, самастойнасць мыслення, уменне выкарыстоўваць веды сумежных галін ведаў, уменне аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю, уменне выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач, а таксама валоданне сістэмным і параўнальным аналізам.

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў вуснай форме і прадугледжвае адказ на пытанні білета. Узровень навукова-тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі студэнтаў ацэньвае дзяржаўная экзаменацыйная камісія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## Тэма 1. Прыярытэтныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры

Культурная палітыка як сістэмны атрыбут агульнадзяржаўнай палітыкі, выпрацоўкі сацыяльна-культурных каштоўнасных арыенціраў, стварэння магчымасцей для культурнага самаразвіцця асобы, развіцця грамадскіх рухаў і фарміраванняў у сферы культуры. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь». Прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры.

Роля дзяржавы ў кіраванні сацыяльна-культурнай сферай: заканадаўчае і адміністратыўнае рэгуляванне; непасрэднае ажыццяўленне эканамічнай дзейнасці. Кіраўніцкія рычагі дзяржавы. Множнасць суб’ектаў культурнай палітыкі (органы дзяржаўнай улады, культурныя інстытуты, творчыя работнікі).

## Тэма 2. Структура органаў дзяржаўнага кіравання ў галіне культуры

Станаўленне і развіццё інстытутаў кіравання культурай у Рэспубліцы Беларусь. Ажыццяўленне дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры. Структура кіраўніцкіх органаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Галоўныя функцыі Міністэрства культуры па захаванні, развіцці і распаўсюджванні культуры. Мясцовыя органы кіравання культурай у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам краіны. Дзейнасць спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Асаблівасці кіравання арганізацыямі культуры. Інавацыйныя (праектаванне) і традыцыйныя (адміністраванне) падыходы ў развіцці сістэмы кіравання сферай культуры. «Тэхналагічны» (алгарытмічны) і «асобасны» (інтуітыўны) падыходы ў арганізацыі дзейнасці ўстаноў культуры.

## Тэма 3. Мэты і функцыі менеджменту

Мэта кіравання як жаданыя паводзіны сістэмы, генеральны імператыў дзеянняў. Фарміраванне і замацаванне мэт (палітыка арганізацыі, місія, планы, юрыдычныя нарматыўныя дакументы). Патрабаванні да фармулёвак мэт і іх класіфікацыя. «Дрэва мэт». Паняцце і прыкметы функцый. Функцыі: *планавання* (азначэнне будучыні тэндэнцый і перспектыў развіцця аб’екта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіравання); *арганізацыі* (стварэнне, развіццё і захаванне структуры прадпрыемства; дэлегаванне паўнамоцтваў; рэгламентацыя); *матывацыі* (заахвочванне работніка да працоўнай дзейнасці, змястоўныя і працэсуальныя тэорыі); *кантролю* (забеспячэнне мэт арганізацыі; азначэнне якасці і карэкціроўка выконваемых работ); *каардынацыі* (забеспячэнне адзінства і ўзгодненасці ўсіх стадый працэсу кіравання на ўсіх узроўнях іерархічнай структуры арганізацыі). Спецыфічныя функцыі кіравання: падзел на пэўныя бакі і сферы дзейнасці прадпрыемства, у якіх аднаўляюцца кіраўніцкія цыклы.

## Тэма 4. Кіраўніцкія рашэнні як вынік (прадукт) кіраўніцкай працы

Кіраўніцкае рашэнне – творчае, валявое дзеянне суб'екта кіравання, якое складаецца ў выбары мэты, праграмы і спосабаў дзейнасці калектыву па вырашэнні праблемы на аснове аб'ектыўных законаў функцыянавання сістэмы кіравання і аналізу інфармацыі аб яе функцыянаванні. Прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў як псіхалагічны працэс: на аснове інтуіцыі, меркаванняў, рацыянальнага падыходу. Этапы рацыянальнага рашэння.

Патрабаванні да кіраўніцкіх рашэнняў. Фактары эфектыўнасці рашэнняў: трыманне іерархіі, выкарыстанне мэтавых міжфункцыянальных груп, выкарыстанне прамых гарызантальных сувязей, цэнтралізацыя кіраўніцтва. Метады прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў: нефармальныя (эўрыстычныя); экспертныя; колькасныя. Класіфікацыя кіраўніцкіх рашэнняў па функцыянальным змесце; сферы дзеяння; арганізацыі распрацоўкі; характары мэт і перыядзе дзеяння; іерархіі кіравання; маштабе аб'екта кіравання; ступені дакладнасці інфармацыі; спосабе фіксацыі.

## Тэма 5. Кампетэнтнасная мадэль кіраўніка сучаснай установы культуры

Стылі кіраўніцтва: ад аўтарытарнага да ліберальнага. Абумоўленасць індывідуальнага стылю кіраўніка. Лідарства як важны і эфектыўны механізм рэалізацыі ўлады ў арганізацыі. Спосабы ўздзеяння на паводзіны людзей: перакананне, унушэнне, маніпуляцыя, прымус, стымуляванне.

Паняцце статусу і ролі працаўніка. Ролевыя функцыі суб'ектаў сацыякультурных працэсаў: сацыяльныя заказчыкі (рэсур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сатрымальнікі), менеджары-арганізатары, выканаўцы-спецыялісты. Своеасаблівасць сацыяльных роляў спецыяліста культуры, творчы (крэатыўны) і рэпрадуктыўны характар выканання роляў. Кампетэнтнасная мадэль кіраўніка сучаснай установы культуры (канцэптуальнасць, кантэкстуальнасць, тэхналагічнасць, адаптыўнасць, камунікатыўнасць, інтэгратыўнасць). Спецыфічны характар узаемадзеяння менеджара з выканаўцам (артыстам, мастаком, прафесійным або аматарскім калектывам).

## Тэма 6. Сацыяльна-культурнае прызначэнне і тыпалогія ўстаноў сацыякультурнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь

Сацыяльна-культурная сфера – вытворчасць, размеркаванне, захаванне і арганізацыя спажывання тавараў і паслуг сацыяльна-культурнага і інфармацыйнага прызначэння для задавальнення культурных і інфармацыйных патрэб насельніцтва. Разгалінаваная інфраструктура сацыякультурнай сферы: адукацыйныя, выхаваўчыя, інфармацыйныя, прыродаахоўныя, рэкрэацыйныя і іншыя дзяржаўныя і грамадскія інстытуты. Асноўныя фактары, якія вызначаюць спецыфіку гаспадарчай, эканамічнай дзейнасці сацыякультурных устаноў: некамерцыйны статус і своеасаблівасць прадукту, прапанаванага на рынак спажывання. Місія ўстаноў культуры. Культурныя прадукты, прадукт-паслуга. Уклад культуры і мастацтва ў развіццё сучаснага грамадства (сацыяльны і эканамічны). Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры.

## Тэма 7. Кіраванне персаналам ва ўстановах сферы культуры

Развіццё канцэпцыі кіравання персаналам: ад разумення «чалавек – элемент сістэмы» да паняцця «прадпрымальны чалавек». Дзяржаўная кадравая палітыка Рэспублікі Беларусь.

Кадравы менеджмент – кіраванне персаналам, накіраванае на паляпшэнне эканамічнага становішча арганізацыі, садзейнічанне ў адаптацыі працаўніка да знешніх умоў. Мэта, асноўныя задачы і функцыі кадравага менеджменту. Паняцце «кадры». Кадравы патэнцыял. Кадравы цыкл. Класіфікацыя персаналу. Штатны расклад. Маркетынг персаналу. Лізінг персаналу. Сістэма падбору персаналу на аснове дзелавых якасцей кандыдатаў і патрабаванняў пасад. Профіль-метад. Ратацыя і вылучэнне кадраў. Прафесіяграмы пасад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці станаўлення і перспектывы развіцця творчага калектыву ў сферы культуры. Маральна-псіхалагічны клімат як інтэгральная характарыстыка творчага калектыву.

## Тэма 8. Праграмна-мэтавы і нарматыўны змест кіравання ў сферы культуры

Асноўныя прынцыпы і сутнасныя прыкметы праграмна-мэтавага кіравання. Праектаванне–планаванне–праграмаванне: узаемасувязь і адрозненні. Сацыяльна-культурнае праграмаванне як навукова-абгрунтаваны працэс стварэння новага ці перабудовы наяўнага сацыякультурнага асяроддзя. Сацыяльна-творчы заказ як сродак рашэння сацыяльна-культурных задач, стымулявання творчага пошуку, падтрымкі таленавітых аўтараў і выканаўцаў.

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь – 2020 (падраздзел «Развіццё нацыянальнай культуры»). Дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры Рэспублікі Беларусь. Нацыянальныя праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь. Рэгіянальныя культурныя праграмы (улік мясцовых традыцый і ўмоў культурнага развіцця). Сістэма дзяржаўных сацыяльных стандартаў Рэспублікі Беларусь. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных мінімальных стандартах».

## Тэма 9. Механізмы фінансавання арганізацый культуры ў Рэспубліцы Беларусь

Адказнасць дзяржаўных органаў за развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы створаных арганізацый культуры; за выкананне дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры; за ажыццяўленне інфармацыйных, асветных, адукацыйных, выхаваўчых, забаўляльных і іншых функцый некамерцыйнага характару ў галіне культуры (у адпаведнасці з Законам аб культуры). Узроўні бюджэтнага фінансавання: нарматыўны (забеспячэнне патрэбнага стану матэрыяльнай базы), змястоўны (для стварэння і рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў і праграм), сацыяльны (ці кампенсацыйны, па каштарысе бягучых выдаткаў). Гаспадарчы разлік (самастойнае пакрыццё бягучых выдаткаў дзяржаўным прадпрыемствам). Камерцыйны разлік (метад вядзення прыватнага прадпрыемства).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пазабюджэтная дзейнасць: арганізацыя платных паслуг; прыцягненне і акумуляванне сродкаў з розных крыніц (спонсарства, патранаж і дабрачыннасць).

### Тэма 10. Фандрайзінг – як сістэма прыцягнення дадатковых рэсурсаў для арганізацыі эфектыўнай дзейнасці ўстаноў культуры

Гісторыя ўзнікнення і вызначэнне фандрайзінгу. Асноўныя этапы фандрайзінгавай кампаніі: планаванне, рэалізацыя, кантроль, аналіз. Метады рэалізацыі фандрайзінгавай кампаніі. Тэле-, паштовы, індывідуальны фандрайзінг. Асноўныя віды фандрайзінгу: праектны, аператыўны. Падатковае стымуляванне ў рамках фандрайзінгу.

### Тэма 11. Фінансавы менеджмент: яго асновы і змест

Паняцце «фінансавы менеджмент». Зараджэнне фінансавага менеджменту і яго развіццё. Віды фінансавага менеджменту. Мэты і задачы фінансавага менеджменту. Аб’екты і суб’екты фінансавага менеджменту. Функцыі фінансавага менеджменту. Арганізацыя фінансавага менеджменту ў рыначнай і пераходнай да яе эканоміцы.

Базавая канцэпцыя фінансавага менеджменту. Іншыя канцэпцыі фінансавага менеджменту: канцэпцыя ідэальных рынкаў капіталу; дыскантаванага грашовага патоку; структуры і кошту капіталу; кампрамісу паміж рызыкай і прыбытковасцю; канцэпцыя «партфеля»; альтэрнатыўных выдаткаў.

### Тэма 12. Рэклама і PR у структуры маркетынгавых камунікацый

Канцэпцыя інтэграваных маркетынгавых камунікацый як эфектыўны падыход сучаснага маркетынгу. Мэты маркетынгавых камунікацый.

Асноўныя сродкі маркетынгавых камунікацый: рэклама, сувязі з грамадскасцю, стымуляванне збыту, прамы продаж. Аналіз відаў камунікацый з пункту гледжання спажыўца (інфармацыя з недыферэнцыраваных крыніц). Аспекты інтэграваных камунікацый: знешняя інтэграцыя, вертыкальная інтэграцыя, гарызантальная інтэграцыя і іх праяўленні ў рэкламнай справе. Выкарыстанне інтэрактыўных маркетынгавых камунікацый у рэкламе і PR. Зваротная сувязь як асноўны крытэрый рэклам-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных тэхналогій у ІМС. Узаемадзеянне рэкламных і PR-мерапрыемстваў у рамках канцэпцыі інтэграваных маркетынгавых камунікацый.

### Тэма 13. Інструментарый PR: стандартныя сродкі, дадатковыя сродкі, спецыяльныя мерапрыемствы

Паняцце камунікатыўнай стратэгіі і камунікатыўнай тактыкі. Фактары выбару камунікатыўных тактык (мэтавая аўдыторыя, каштоўнасці спажыўца, камунікатыўныя звычкі камунікатара і рэцыпіента, стыхійны і кіруемы імідж).

Стандартныя тактычныя сродкі: прэс-рэлізы, прэс-кіты, прэс-канферэнцыі, брыфінгі, інтэрнэт-камунікацыі, тэматычныя матэрыялы ў СМІ, інфармацыйныя бюлетэні, буклеты і г.д. Дадатковыя тактычныя сродкі: карпаратыўныя інфармацыйныя матэрыялы (справаздачы, профілі кампаніі), выступленні кіраўніцтва арганізацыі, канферэнцыі і г.д. Спецыяльныя мерапрыемствы і PR-акцыі: прэзентацыі, акцыі, святы, выставы, аўкцыёны, латарэі, конкурсы.

### Тэма 14. Змест і структура маркетынгу ў сацыякультурнай сферы

Маркетынг як тэорыя і практыка арганізацыі дзелавой актыўнасці на рынку і тэхналогія ўплыву на рыначную сітуацыю. Магчымасці маркетынгу ў развіцці сферы культуры, эфектыўнай дзейнасці яе ўстаноў і арганізацый, паспяховай рэалізацыі канкрэтных праектаў.

Маркетынгавы комплекс: 1) рыначныя сілы: пакупніцкія паводзіны спажыўца; гандлёвыя паводзіны (гандляры оптам і ў розніцу); пазіцыі і паводзіны канкурэнтаў; паводзіны вышэйшага кіраўніцтва; 2) элементы маркетынгу: планаванне прадукту (уключна ўпакоўка і маркіроўка); цэнаўтварэнне; месца (абсталяванне і каналы руху прадукту); прасоўванне (рэклама, каналы збыту, персанальны продаж, сувязі з грамадскасцю); абслугоўванне; канстатаванне фактаў і іх аналіз. Асаблівасці маркетынгу ў сферы культуры.

### Тэма 15. Асноўныя сектары рынку сферы культуры і іх асаблівасці

Сектары рынку сферы культуры: спажывецкі рынак, рынак дыстрыб'ютараў, дзяржаўны бюджэт, спонсары. Спажывецкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рынак і сучаснае мастацтва. Сучаснае мастацтва, рэпрэзентаванае праз «высокую» (элітарную), народную (фальклор) і масавую культуру. Прадукты масавай культуры як рыначны тавар і іх адметныя рысы. Фактары, якія ўздзейнічаюць на спажывецкі рынак: грамадскае меркаванне, тэндэнцыі, густ, сацыядэмаграфічныя пераменныя.

Змест і асаблівасці маркетынгавай дзейнасці. Ёмістасць рынку. Кан'юнктура рынку. Асноўныя тыпы канкурэнцыі: унутраная – канкурэнцыя ўнутры адной катэгорыі прадуктаў; паміж рознымі тыпамі культурных прадуктаў; паміж прадуктамі мастацкай культуры і іншымі прадуктамі для правядзення вольнага часу.

## Тэма 16. «Жыццёвы цыкл» прадукту і паслугі ў сферы культуры

Тэрмін «прадукт» у сферы культуры як аб'ект, паслуга або вопыт. Тры асноўныя кампаненты прадукту: асноўны прадукт або сам аб'ект; спадарожныя паслугі; каштоўнасць (сімвалічная, эмацыянальная). Вымярэнні культурнага прадукту: параўнальнае, тэхнічнае, эмацыянальнае. Азначэнне тэрміна «культурны прадукт». Культурны прадукт – складаны прадукт. Распрацоўка эфектыўнай маркетынгавай стратэгіі ў залежнасці ад стаўлення спажыўца. Прадуктовыя лініі і рады. Тэрмін «глыбіня прадуктовай лініі». «Кампаніі аднаго прадукту» (гастрольныя тэатральныя або цыркавыя трупы, якія паказваюць адну пастаноўку за сезон). Паняцце прадуктовай сумесі (у дачыненні да кампаній, у задачы якіх уваходзіць прасоўванне і распаўсюджанне дасугавых паслуг). Густ: яго ўздзеянне на жыццёвы цыкл прадукту.

## Тэма 17. Сувязі з грамадскасцю як камунікатыўны феномен сучаснай сусветнай культуры

«Сувязі з грамадскасцю» ў сістэме навуковага ведання і адукацыйных дысцыплін. Асноўныя прынцыпы і функцыі сувязей з грамадскасцю. Суадносіны паняццяў «сувязі з грамадскасцю» (СГ), «public relations», рэклама, прапаганда і «сродкі камунікацыі».

Тэндэнцыі рэлятывізму, абсалютызму і ўніверсалізму ў сучасных даследаваннях маркетынгавых камунікацый. Актуалізацыя праблем сувязей з грамадскасцю ва ўмовах рынкавай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэлі культуры. Своеасаблівасць сувязей культуры ў сістэме менеджменту сацыякультурных практык у Рэспубліцы Беларусь. «Транскультурны менеджар» як новы тып менеджара, які валодае камунікатыўнымі навыкамі выбудоўвання і падтрымкі сувязей з грамадскасцю і крос-культурнай кампетэнтнасцю.

## Тэма 18. Разнастайнасць форм і відаў мерапрыемстваў па сувязях з грамадскасцю: класіфікацыя дакументаў у сувязях з грамадскасцю, планаванне і падрыхтоўка праграм у СГ

Планаванне праграм у СГ. Тыпалогія праграм у СГ. Паняцце стратэгіі і тактыкі СГ. Асаблівасці рэалізацыі СГ. Вызначэнне мэтавай і ключавой аўдыторый. Віды і катэгорыі мэтавых аўдыторый. Аўдыторыя ўнутраная і аўдыторыя знешняя. Вызначэнне паняццяў «лідары грамадскай думкі» і групы інтарэсаў. Вызначэнне паняццяў: эканамічная (бізнес) супольнасць, фінансавая супольнасць, палітычнае асяроддзе, сацыяльна-культурнае асяроддзе, прафесіянальнае асяроддзе, экалагічнае асяроддзе.

## Тэма 19. Асаблівасці выкарыстання сродкаў камунікацый у PR-мерапрыемствах

Віды рабочых PR-дакументаў, якія выкарыстоўваюцца ў рабоце са СМІ, мэтавымі аўдыторыямі і патрабаванні да іх. Прэс-канферэнцыя і брыфінгі. Тематычныя семінары. Тэматычныя прэс-сняданкі і круглыя сталы. Трэнінгі на эфектыўныя ўзаемаадносіны са СМІ. Адкрыццё і вядзенне спецыялізаваных рубрык у СМІ. Стварэнне і абнаўленне баз даных мэтавых СМІ. Гадавыя сходы акцыянераў. Спецыялізаваныя тэматычныя семінары і канферэнцыі.

Навуковыя форумы і сімпозіумы. Спонсарскія і дабрачынныя акцыі. Сэмплінгі (sampling). Масавыя культурна-забаўляльныя праграмы.

Арганізацыя і кіраўніцтва працай «гарачай лініі» для персаналу. Святкаванне гадавін, юбілеяў і «круглых» дат. Арганізацыя і правядзенне дзён адчыненых дзвярэй і візітаў на прадпрыемства. Вытворчасць карпаратыўных відэа- і тэлефільмаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 20. Псіхалагічныя падставы ў практыцы выкарыстоўвання СМІ ў сістэме СГ

Псіхалагічныя падставы фарміравання мэт PR-тэхналогій. Псіхааналітычныя падставы рэкламы і PR. Эканамічная псіхалогія і кагнітыўныя даследаванні ў сістэмах СГ. СГ і нейралінгвістычнае праграмаванне. Відовішчна-сугестатыўныя функцыі PR. Псіхатронныя тэхналогіі і масавая свядомасць.

Псіхалогія ўспрымання асобных уласцівасцей прадметаў і магчымасці выкарыстання ўспрымальных характарыстык у СГ. Магчымасці колеру, гуку ў рэкламе і PR-дзейнасці. Псіхалагічныя падставы ўспрымання PR-аб'екта.

Псіхалагічныя падставы і практычныя асаблівасці выкарыстоўвання розных відаў камунікацыі ў СГ і PR-кампаніях. Выкарыстанне Інтэрнэта ў public relations. Карпаратыўныя website. Тэхнічныя СМІ – друк (газеты, журналы), інфармацыйныя агенцтвы, інфармацыйныя PR-сеткі, паліграфія і кнігадрукаванне, тэлефон і сотавая сувязь, тэлеграф, факсімільная і пэйджынгавая сувязь, кінематограф. Псіхалагічныя крытэрыі адбору і ацэнкі эфектыўнасці выкарыстання сродкаў камунікацыі для розных PR-мерапрыемстваў і праграм. Віды і спецыялізацыя СМІ. Стратэгія і тактыка ўзаемаадносін з мясцовымі, рэгіянальнымі, цэнтральнымі і міжнароднымі СМІ.

## Тэма 21. Катэгарыяльны інструментарый і асноўныя паняцці праектнага менеджменту ў кантэксце прыкладной культуралогіі

Суадносіны паняццяў «праект», «праектаванне» і «кіраванне праектам» у сістэме праектнага менеджменту. Праектаванне як разнавіднасць інавацыйнай, творчай і кіраўніцкай дзейнасці. Тыпы праектаў (тэхнічны, арганізацыйны; эканамічны, сацыяльны; змешаны). Праекты развіцця. Праекты асноўнай вытворчасці. Сацыяльныя праекты. Art-праекты. Структурызацыя праекта (кампаненты прадукцыі праекта; этапы жыццёвага цыкла; элементы арганізацыйнай структуры) і лагічная сістэмнасць праекта. Сістэма якасных і колькасных характарыстык праектаў. Агульная гатоўнасць да змяненняў, культура канфліктаў, асабістая адказнасць супрацоўнікаў праекта, культура даверу, камунікатыўная і інфармацыйная культура як асноўныя характарыстыкі паспяховага праекта. Накіраванасць на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасягненне мэт як рухаючая сіла праекта і фактар яго эфектыўнасці. Комплексны характар мэт праекта як неабходная ўмова яго ажыццяўлення. Каардынаванае выкананне ўзаемазвязаных дзеянняў пры планаванні праекта. Часавыя і прасторавыя характарыстыкі праектаў. Аднакратны характар праектнай дзейнасці. Унікальнасць і ўніверсальнасць як характарыстыкі праекта. Паказчыкі эфектыўнасці праекта.

Суб'ект і аб'ект праектавання. Асяроддзе і ўдзельнікі праекта. Паняцце «каманда праекта». Арганізацыйная структура праекта. Патрабаванні да сертыфікаванага кіраўніка праектамі (Certificated Project Manager – CPM). Патрабаванні да сертыфікаванага прафесіянала па кіраўніцтве праектамі (Registered Project Management Professional – RPMP). Патрабаванні да сертыфікаванага кіраўніка па кіраванні праектамі (Certificated Project Management Professional – CPMP). Роля, задачы і функцыі менеджара праекта. Каманда кіравання праектам. Узаемадзеянне праектных і функцыянальных кіраўнікоў. Лідарства і кіраванне камандай праекта. Карпаратыўная сістэма кіравання праектамі. Размеркаванне абавязкаў і роляў удзельнікаў праекта. Роля сацыякультурнага менеджара ў кіраванні art-праектам. Правілы актыўнага слухання і зваротнай сувязі ў камандзе па кіраўніцтве праектам.

## Тэма 22. Інструментарый і сістэма эканамічнага і тэхналагічнага комплексаў кіравання праектам

Асноўныя працэдуры і метадалогія кіравання праектам. Функцыі кіравання праектам. Камунікацыйная сістэма праекта. Маркетынг праектаў. Кіраванне рызыкамі праекта. Ініцыяцыя праекта; вызначэнне асяроддзя праекта, планаванне праекта; арганізацыя і кантроль выканання праекта; аналіз і ўнясенне карэкціруючых дзеянняў у ход выканання праекта; закрыццё праекта ці яго этапу як асноўныя працэсы кіравання праектам. Стратэгічны, аператыўны, часавы і інш. узроўні кіравання праектам. Арганізацыя праектнага офіса і дакументы праекта. Арганізацыйныя структуры кіравання праектамі. Вызначэнне жыццяздольнасці праекта. Smart-тэхналогія. Пастаноўкі мэт і задач праекта. Прамыя вынікі праекта. Уздзеянне праекта. Індыкатары ацэнкі дасягнення вынікаў праекта.

Інструменты тэхналагічнага комплексу кіравання праектам. Апісанне праекта і структурны план праекта. Узаемасувязь і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роля розных фаз праекта (планаванне, рэалізацыя, ацэнка). Тэхніка творчасці і праектны кантролінг. Жыццёвы цыкл праекта. Ініцыяцыя праекта і складанне статута праекта. Актывы арганізацыйнага працэсу. Базы ведаў арганізацыі. Распрацоўка каляндарнага графіка праекта. Методыкі аптымізацыі каляндарнага графіка. Экстрэмальнае кіраванне праектамі. Фактары, якія ўздзейнічаюць на поспех праекта. Складанне бюджэта праекта. Планаванне мерапрыемстваў забеспячэння якасці. Прэзентацыя праектнага вырашэння.

Аптымізацыя плана праекта і фінансавае суправаджэнне праекта. Аналіз і аптымізацыя каляндарнага плана. Вартасны аналіз праекта. Парадак планавання і аналізу выдаткаў на праект. Асваенне метадаў аптымізацыі вартасці праекта. Віды праектнай рызыкі і падыходы да кіравання рызыкамі. Ідэнтыфікацыя рызыкі. Планаванне рэакцыі на праектныя рызыкі: стварэнне часовага буфера. Ацэнка фінансавых вынікаў праекта.

### Тэма 23. Фінансаванне культуры ў еўрапейскіх краінах

Мадэлі дзяржаўнага фінансавання культуры ў свеце. Амерыканская мадэль фінансавання культуры і выкарыстанне яе элементаў у краінах Еўрапейскага саюза, краінах СНД і іншых краінах Еўропы. Асноўныя падыходы да фінансавання сферы культуры ў краінах Заходняй Еўропы. Французская мадэль і яе характарыстыка. Брытанская мадэль фінансавання і яе асаблівасці. Роля праграм Еўрасаюза ў фінансаванні міжнароднага еўрапейскага культурнага супрацоўніцтва. Фінансаванне сферы культуры ў краінах СНД, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Выкарыстанне еўрапейскага вопыту фінансавання культурных праектаў у Беларусі.

### Тэма 24. Падрыхтоўка менеджараў у сферы культуры за мяжой (ЗША, Вялікабрытанія, Германія і інш.)

Агульныя падыходы да працэсу падрыхтоўкі менеджараў у сферы культуры за мяжой. Праектны падыход як аснова канцэпцыі адукацыйнага працэсу. Роля практыкі і стажыроўкі ў вучэбных планах падрыхтоўкі. Сістэма падрыхтоўкі менеджараў у сферы культуры ва ўстановах вышэйшай адукацыі (класічныя і новыя ўніверсітэты, вышэйшыя школы і каледжы, установы мастацкай і культуралагічнай адукацыі). Сістэма

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі менеджараў у сферы культуры за мяжой. Роля адукацыйных установ, устаноў культуры і мастацтва, камерцыйных арганізацый (прадзюсарскія цэнтры, канцэртныя і рэкламныя арганізацыі і інш.) у сістэме падрыхтоўкі менеджараў. Еўрапейскія фонды і праграмы падрыхтоўкі менеджараў (фонд Марсэля Хіктэра, Роберта Боша, культуркантакт і інш.).

### Тэма 25. Менеджмент у сферы культуры Японіі

Асаблівасці японскай эканамічнай мадэлі арганізацыі вытворчасці і яе выкарыстанне ў сферы культуры. Значэнне сістэмы пажыццёвага найму ў павышэнні эфектыўнасці дзейнасці ўстаноў культуры. Прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў галіне зберажэння, развіцця і прапаганды японскай культуры. Японскія фонды ў фінансаванні міжнародных арганізацый і праектаў у сферы культуры (ЮНЕСКА). Турызм як форма прапаганды японскай культуры.

### Тэма 26. Арганізацыя вольнага часу ў ЗША

Фарміраванне сістэмы арганізацыі вольнага часу ў канцы XIX – першай палове XX ст. Асноўныя канцэпцыі арганізацыі вольнага часу ў ЗША. Роля федэральнай і мясцовай улады. Роля грамадскіх аб'яднанняў, дабрачынных фондаў і прыватных ахвяраванняў у фінансаванні ўстаноў культурна-адпачынкавай дзейнасці. Канцэртныя, тэатральныя, музейныя ўстановы, тэматычныя і прыродныя паркі, запаведнікі, пляжы ў сістэме арганізацыі вольнага часу ў ЗША. Турызм як форма арганізацыі вольнага часу і яго асаблівасці.

### Тэма 27. Фестывальны менеджмент у краінах Заходняй Еўропы

Роля міжнародных (еўрапейскіх) арганізацый у фестывальным менеджменце. Еўрапейскія кінафестывалі. Берлінскі кінафестываль як «фестываль масавага гледача». Фестывалі элітарнага кіно (Канскі, Венецыянскі). Тэатральныя фестывалі ў еўрапейскіх краінах як форма міжнароднага супрацоўніцтва. Музычныя фестывалі па кірунках музычнага мастацтва. Фальклорныя фестывалі ў кантэксце рэгіянальнай палітыкі ў сферы турызму. Фестывалі сучаснага выяўленчага мастацтва. Дзіцячыя і маладзёжныя фестывалі. «Еўрабачанне». Удзел беларускіх калектываў і выканаўцаў у еўрапейскіх фестывалях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 28. Развіццё экатурызму ў краінах Заходняй Еўропы

Паняцце экатурызму, еўрапейскія краіны як заснавальнікі экатурызму. Сувязь экатурызму з іншымі відамі турызму (аздараўленчы, культурны, спартыўны, гастранамічны і інш.). Асаблівасці развіцця экатурызму ў Скандынаўскіх краінах. Экатурызм у Вялікабрытаніі. Экатурызм і культурны турызм у Францыі, Італіі і Іспаніі. Экатурызм і спартыўны турызм у Швейцарыі. Уплыў традыцый заходнееўрапейскага экатурызму на развіццё экатурызму ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

## Тэма 29. Міжнародныя культурныя сувязі беларускіх зямель у перыяд Кіеўскай Русі

Фактары, якія ўплывалі на фарміраванне культурных статусаў беларускіх зямель з краінамі Еўропы і Азіі ў IX–XII стст.: геаграфічны, палітычны, эканамічны і інш. Фарміраванне ўсходнеславянскай культуры. Хрышчэнне беларускіх зямель і яго ўплыў на ўзмацненне культурных сувязей з Візантыяй і Балканскімі дзяржавамі. Хрысціянская культура і развіццё мураванага дойлідства ў Беларусі (Полацкі Сафійскі сабор, Каложская царква ў Гародні і інш.). Музычнае, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў кантэксце ўсходнехрысціянскай традыцыі. Міжнародны ўплыў на развіццё адукацыі і асветы на беларускіх землях. Роля манастыроў у гэтым працэсе. Беларускія асветнікі Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Кліменцій Смаляціч.

## Тэма 30. Міжнародныя культурныя сувязі беларускіх зямель у складзе ВКЛ

Змяненне палітычнай сітуацыі на беларускіх землях у XIII ст. Пагроза з боку тэўтонскага ордэна і яе ўплыў на стасункі з краінамі Заходняй Еўропы і Польшчы. Крэўская унія (1385) і распаўсюджанне каталіцызму (з 1387 г.) як фактар актыўнага пранікнення ў Беларусь заходнееўрапейскай культуры.

Культурныя і рэлігійныя ўзаемаадносіны з Маскоўскай дзяржавай. Развіццё адукацыі і асветы ў Беларусі ў міжнародным кантэксце XIII–XVI стст. Узнікненне брацкіх школ і езуіцкіх калегіумаў. Уплыў ідэй еўрапейскага Рэнесансу на духоўную і мастацкую культуру. Архітэктура Беларусі XIII–XVI стст. у міжнародным кантэксце. Еўрапейскі ўплыў на музычную культуру Беларусі. Музычнае і тэатральнае мастацтва ў еўрапей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скім і ўсходнеславянскім кантэксце. Уплыў еўрапейскіх майстроў на развіццё выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

### Тэма 31. Асаблівасці развіцця культурнага супрацоўніцтва беларускіх зямель у XVI ст.

Узнікненне пратэстантызму ў краінах Заходняй Еўропы і яго ўплыў на культурную сітуацыю ў Беларусі. Развіццё кнігадрукавання ў Беларусі ў міжнародным кантэксце. Францыск Скарына, Пётр І, Іван Фёдараў. Пратэстанцкія тыпаграфіі (Нясвіж, Брэст і інш.). Дзейнасць Сымона Буднага. З'яўленне езуітаў у Беларусі (1569): іх адукацыйная дзейнасць. Езуіцкія калегіумы, вышэйшыя калегіумы і акадэміі. Праваслаўныя брацкія школы. Выяўленчае мастацтва, тэатр, музычныя калектывы ў маёнтках паноў і шляхты. Літаратура: «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага.

### Тэма 32. Міжнародныя культурныя сувязі беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай

Люблінская унія 1569 г. і яе ўплыў на нацыянальныя працэсы на беларускіх землях. Апалячванне і акаталічванне часткі беларускага грамадства. Еўрапейскае барока і яго праяўленне ў Беларусі ў галіне жывапісу, архітэктуры, музыкі, літаратуры. Батлейка і прыгонныя тэатры. Тэатральныя трупы ў Нясвіжы, Слоніме, Шклове і інш. Развіццё навукі і літаратуры: Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, Ілля Капіевіч. Развіццё адукацыі ў Беларусі ў міжнародным кантэксце. Віленская вышэйшая школа (універсітэт).

### Тэма 33. Культурныя сувязі беларускіх зямель у перыяд уваходжання ў склад Расійскай імперыі

Паўстанні 1830–1831 гг. і 1853 г. і працэсы русіфікацыі на беларускіх землях. Адукацыя ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Закрыццё Віленскага ўніверсітэта. Горыцкая сельскагаспадарчая школа (акадэмія). Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Уплыў расійскай культуры XIX – пачатку XX ст. на развіццё культуры Беларусі. Літаратура: Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала, Якуб Колас. Развіццё тэатральнага мастацтва. Прафесійная тэатральная трупа Ігната Буйніцкага. Выяўленчае мастацтва. Іван Хруцкі. Беларускія мастакі Парыжскай школы: Марк Шагал, Хаім Сюцін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 34. Культурныя сувязі Беларусі ў складзе СССР

Скарачэнне культурных адносін з замежнымі краінамі і развіццё сувязей з народамі СССР у даваенны перыяд. Змены ў міжнародным становішчы Еўропы і свету падчас Другой сусветнай вайны. Стварэнне ААН і ўдзел у яе дзейнасці БССР. Культурныя сувязі з краінамі народнай дэмакратыі. Супрацоўніцтва з Польскай Народнай Рэспублікай у рэгіёнах памежжа. Аднаўленне работы Беларускага таварыства культурных сувязей з замежнымі краінамі і яго дзейнасць у пасляваенны перыяд. Распад каланіяльнай сістэмы і яго ўплыў на пашырэнне геаграфіі культурнага супрацоўніцтва БССР. Актывізацыя МКС у другой палове 70-х гг. XX ст. Фарміраванне асноўных форм міжнароднага культурнага супрацоўніцтва. Змены МКС у перыяд перабудовы.

### Тэма 35. Культурныя сувязі Рэспублікі Беларусь у перыяд незалежнасці

Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» і мэты дзяржавы ў галіне міжнародных культурных сувязей. Культурнае супрацоўніцтва з краінамі СНД.

Еўрапейскае культурнае супрацоўніцтва. Культурныя сувязі з краінамі Азіі, Афрыкі і Амерыкі. Асноўныя формы культурнага супрацоўніцтва ў галіне музейнай справы, кіно, тэатральнага, музычнага, выяўленчага, харэаграфічнага мастацтваў. Міжнародныя фестывалі ў Рэспубліцы Беларусь. Стварэнне беларускіх культурна-інфармацыйных цэнтраў як інструмент прапаганды нацыянальнай культуры за мяжой. Дні культуры Беларусі за мяжой. Дні культуры замежных краін у Беларусі. Супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі (ЮНЕСКА і інш.).

### Тэма 36. Функцыянаванне механізму супрацоўніцтва з ЮНЕСКА

Мэты ўдзелу ў праграмах ЮНЕСКА. Фінансаванне праектаў з боку ЮНЕСКА па прынцыпе «грошы-насенне». Статус праектаў, якія праводзяцца пад эгідай ЮНЕСКА. Магчымасць замежнага фінансавання з боку міжнародных фондаў.

Дзейнасць Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА як склад і механізм функцыянавання. Парадак падачы і разгляду заявак па ўдзеле ў праграмах ЮНЕСКА. Фінансаванне ў межах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«праграмы ўдзелу» з боку Штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы. Фінансаванне з боку клястара (Маскоўскае бюро ЮНЕСКА). Састаўленне заявак і парадак іх разгляду. Асаблівасці, звязаныя з удзелам у праграмах ЮНЕСКА (выкарыстанне сродкаў, складанне выніковых і фінансавых справаздач і інш.). Супрацоўніцтва з Нацыянальнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Супрацоўніцтва з нацыянальнымі ўстановамі і арганізацыямі падчас удзелу ў праграмах ЮНЕСКА.

## Тэма 37. Стратэгія ЮНЕСКА ў галіне культурнага супрацоўніцтва і развіцця

Буйная праграма «Культура», яе асноўныя мэты, задачы. Захаванне культурнай спадчыны чалавецтва як стрыжань стратэгіі ЮНЕСКА ў галіне культуры. Палітыка падтрымкі культурнай разнастайнасці ў кантэксце праблем культурнай глабалізацыі.

Спіс ЮНЕСКА – галоўны інструмент у галіне захоўвання матэрыяльнай і прыроднай спадчыны чалавецтва. Аб'екты матэрыяльнай і прыроднай спадчыны ў спісе ЮНЕСКА (Мірскі замак, Белавежская пушча і інш.).

Зберажэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны як прыярытэт дзейнасці ЮНЕСКА на сучасным этапе. Канвенцыя «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (2003) і яе асноўныя палажэнні. Ратыфікацыя і рэалізацыя Канвенцыі ў Беларусі (абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага раёна). Спіс шэдэўраў нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Прычыны ўключэння ў спіс ЮНЕСКА нематэрыяльнай спадчыны, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Праграма «Памяць свету».

## Тэма 38. Міжкультурныя камунікацыі праз стратэгію ЮНЕСКА ў галіне адукацыі і навукі

Асаблівасці выкарыстання адукацыйных і навуковых праектаў у МКС.

Буйная праграма «Адукацыя». Асноўныя мэты і задачы. Адукацыя для ўсіх на працягу ўсяго жыцця. Рэалізацыя праектаў, звязаных з адукацыяй для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў Беларусі. Праекты па перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі ў галіне культуралагічнай і мастацкай адукацыі ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Буйная праграма «Навука». Асноўныя мэты і задачы. Навука ў мэтах устойлівага развіцця. Паняцце ўстойлівага развіцця для планавання і рэалізацыі міжнародных культурных праектаў пры падтрымцы ЮНЕСКА. Экалагічныя праекты ў Беларусі як прыярытэт у рэалізацыі стратэгіі ЮНЕСКА ў галіне навукі.

## Тэма 39. ЮНЕСКА – галоўная міжнародная арганізацыя ў галіне МКС

Гісторыя стварэння ЮНЕСКА (1945), яе асноўныя мэты. Дзейнасць Беларусі ў ЮНЕСКА з 1954 г. Структуры ЮНЕСКА. Генеральная канферэнцыя, Сакратарыят ЮНЕСКА, клястары (Маскоўскае бюро ЮНЕСКА), нацыянальныя камісіі па справах ЮНЕСКА. Узаемаадносіны паміж структурамі. Кафедры ЮНЕСКА, клубы ЮНЕСКА, інфармацыйныя цэнтры. Сяброўская складчына – як аснова фарміравання бюджэту арганізацыі.

Асноўныя кірункі дзейнасці ў галіне адукацыі, навукі, культуры, інфармацыі і тэлекамунікацыі. Канвенцыі ЮНЕСКА як сродак рэалізацыі стратэгіі і арганізацыі. Механізм узаемадзеяння са структурамі ЮНЕСКА. Спісы ЮНЕСКА.

## Тэма 40. Роля і месца ААН і яе спецыялізаваных структур у галіне міжкультурных камунікацый

Гісторыя стварэння ААН. Асноўныя кірункі дзейнасці ААН. Структуры і механізм дзейнасці ААН. ЮНЕСКА: асноўныя кірункі рэалізацыі палітыкі ААН у галіне адукацыі, навукі і культуры. Сістэма работы структур ЮНЕСКА. Міжнародны дзіцячы фонд (ЮНІСЕФ) як асноўная структура ААН у галіне аховы дзяцінства, творчага развіцця асобы дзіцяці, абароны яго правоў, аховы сям'і і мацярынства. Выкарыстанне праграм ЮНІСЕФ у сістэме МКС. Прадстаўніцтва ЮНІСЕФ у Беларусі і яго дзейнасць на сучасным этапе.

Праграма развіцця ААН (ПРААН). Асноўныя кірункі дзейнасці. Выкарыстанне ў мэтах міжкультурнага супрацоўніцтва такіх кірункаў, як развіццё малога бізнесу, развіццё тэрыторый (малых гарадоў і сельскай мясцовасці), трансгранічнае супрацоўніцтва (Беларусь – Украіна – Польшча, Беларусь – Літва, Беларусь – Латвія), міжнародны турызм, навуковыя распрацоўкі і інш.

Прадстаўніцтва вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі і яго культурна-асветніцкая дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадстаўніцтва ААН у Беларусі і яго інфармацыйна-культурная дзейнасць.

## Тэма 41. Арганізацыі і праграмы ў сістэме МКС: класіфікацыя і характарыстыка

Дзяржаўныя ўстановы, прыватныя прадпрыемствы, грамадскія аб'яднанні, фонды і інш., якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у галіне МКС. Розныя тыпы арганізацый: міжнародныя (ААН, сусветныя арганізацыі ў галіне асобных напрамкаў сацыякультурнай дзейнасці і г.д.); рэгіянальныя (Еўрасаюз і яго структуры, еўрапейскія, азіяцкія, амерыканскія арганізацыі, СНД і інш.); мясцовыя (упраўленне, аддзелы культуры, мясцовыя ўлады і г.д.).

Міжнародныя праграмы культурнага супрацоўніцтва і сістэма іх адміністравання праз спецыялізаваныя структуры, Міністэрства замежных спраў, пасольствы, інфармацыйна-культурныя цэнтры, фонды, грамадскія аб'яднанні і інш.

## Тэма 42. Еўрасаюз у кантэксце міжнароднага (рэгіянальнага) культурнага супрацоўніцтва

Еўрасаюз як буйнейшы патэнцыяльны партнёр Беларусі на еўрапейскім кантыненце. Еўрапейская палітыка суседства – падмурак знешніх адносін ЕС з краінамі-суседзямі. Праграма добрасуседства (2003) і яе асноўныя прынцыпы – сумесны рух да агульных каштоўнасцей – дэмакратыя, правы чалавека, прынцыпы рынкавай эканомікі і ўстойлівае развіццё ў мэтах умацавання палітычнага супрацоўніцтва і эканамічнай інтэграцыі. Магчымасць пашырэння сувязей супрацоўніцтва ў галіне культуры. Распрацоўка спецыяльнай праграмы «Усходняе партнёрства» і далучэнне да яе Беларусі (сумесна з Арменіяй, Азербайджанам, Грузіяй, Малдовай і Украінай) у 2009 г. Магчымасці праграмы ў формах правядзення сумесных культурных акцый, стажыровак, арганізацый кантактаў паміж грамадзянамі. Цяжкасці з рэалізацыяй праграмы «Усходняе партнёрства» на сучасным этапе.

Дзейнасць цэнтраў еўрапейскай інфармацыі і інфармацыі аб Савеце Еўропы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 43. Праграмы тэхнічнай дапамогі, адукацыйныя культурныя праграмы Еўрасаюза, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

Праграмы тэхнічнай дапамогі як найбольш актыўная форма супрацоўніцтва з краінамі ЕС. Развіццё дэмакратыі, аптымізацыя сістэмы дзяржаўнага кіравання, павага і абарона правоў нацыянальных меншасцей, экалагічныя праблемы, стымуляванне маладзёжных кантактаў і трансгранічнага супрацоўніцтва. Культурны кампанент праграм тэхнічнай дапамогі. Сістэма адміністравання праграм праз міністэрствы замежных спраў краін ЕС (пасольствы).

Супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі. Набліжэнне да еўрапейскіх адукацыйных стандартаў для краін, якія не з'яўляюцца членамі ЕС. Балонскі працэс.

Спецыялізаваныя фонды ЕС у сферы культуры. Фонд Марсэля Хіктэра, культуркантакт (менеджмент у сферы культуры) і інш.

### Тэма 44. Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь у межах СНД і Саюзнай дзяржавы

Фактары, якія спрыяюць развіццю культурных сувязей Беларусі з краінамі СНД. Культурнае супрацоўніцтва як адзін з прыярытэтных кірункаў узаемадзеяння з краінамі СНД. Выканаўчы камітэт краін СНД і яго дзейнасць. Фінансаванне праектаў у галіне культуры праз Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва краін СНД. Праекты, якія фінансуюцца з крыніц фонду («Культурная сталіца СНД» і інш.). Перспектыва двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі з краінамі СНД.

Расія як стратэгічны партнёр Беларусі ў галіне гуманітарнага і культурнага супрацоўніцтва. Агульнаславянскія карані, старонкі гісторыі, персаналіі, сучасны стан узаемаадносін як падмурак для рэалізацыі беларуска-расійскіх культурных праектаў.

### Тэма 45. Арганізацыйныя структуры і кірункі міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з краінамі Еўропы

Супрацоўніцтва з краінамі цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы. ФРГ – актыўны ўдзельнік еўрапейскага гуманітарнага партнёрства з Беларуссю. Дзейнасць пасольства Германіі, Інстытута імя Гётэ, Германскай службы акадэмічных абменаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра. Супрацоўніцтва з Рэспублікай Польшча, дзейнасць Польскага інстытута ў Мінску, беларускія культурныя цэнтры ў Польшчы. Культурныя кантакты Беларусь – Францыя. Інстытут Франкафоніі. Асаблівасці дзейнасці Шведскага інстытута. Супрацоўніцтва ў галіне культуры з Італьянскай Рэспублікай. Асаблівасці міжкультурных камунікацый з краінамі Усходняй Еўропы. Перспектыва развіцця культурнага супрацоўніцтва з краінамі Балтыйскага рэгіёна.

## Тэма 46. Арганізацыйныя структуры і кірункі міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з краінамі Азіі і Афрыкі

Супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай у галіне культуры. Міжурадавыя пагадненні. Дні культуры. Дзейнасць Інстытута імя Канфуцыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Развіццё культурнага супрацоўніцтва з краінамі Далёкага Усходу (Карэя, В'етнам, Японія і інш.). Формы міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з Ісламскай Рэспублікай Іран. Дзейнасць Іранскага пасольства ў Мінску. Развіццё культурных сувязей з Турэцкай Рэспублікай, у тым ліку праз грамадскія аб'яднанні беларускіх татар («Аль-Кітай»). Беларуска-ізраільскія культурныя сувязі. Дзейнасць яўрэйскага абшчыннага дома. Краіны Блізкага Усходу ў кантэксце культурнага абмену. Перспектывы развіцця міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з краінамі Паўночнай Афрыкі. Наладжванне культурных сувязей з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай.

Асаблівасці культурнага супрацоўніцтва з ісламскімі краінамі.

## Тэма 47. Арганізацыйныя структуры і кірункі міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з краінамі Амерыкі

Аддзел па сувязях з грамадскасцю пасольства ЗША і яго асноўныя формы і кірункі дзейнасці. Праграмы «малых грантаў» пасольства ЗША. Праграмы Дзяржд эпартамента ЗША ў галіне культуры і адукацыі. Пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла і дзейнасць інфармацыйна-культурнага цэнтра па развіцці культурнага супрацоўніцтва Беларусі з Венесуэлай і іншымі краінамі Лацінскай Амерыкі. Перспектывы развіцця культурнага супрацоўніцтва з Рэспублікай Куба.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патэнцыял пашырэння міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з краінамі Амерыкі (Аргенціна, Чылі, Бразілія і інш.).

## Тэма 48. Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва ў галіне музейнай справы

Прававая база Рэспублікі Беларусь у галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны як аснова для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне музейнай справы. Сетка музеяў у Беларусі і іх удзел у дзейнасці міжнародных арганізацый. Міжнародны савет музеяў (ІКАМОС) – найбольш уплывовая міжнародная музейная арганізацыя. Дзейнасць прадстаўніцтва ІКАМОС у Беларусі. Выставы як форма міжнароднага супрацоўніцтва музеяў. Перадача на дэпазіт (адказнае захоўванне) аб'ектаў культурнай спадчыны. Праблема рэстытуцый. Навуковыя даследаванні, выданні, канферэнцыі і семінары, павышэнне кваліфікацыі і стажыроўкі, рэстаўрацыя як асноўныя формы міжнароднага музейнага супрацоўніцтва. Абмен алічбаванымі фондамі, стварэнне віртуальных музеяў – новыя формы міжнародных кантактаў паміж музеямі. Удзел музеяў у правядзенні буйных міжнародных праектаў. Арганізацыя страхавання і перамяшчэння музейных экспанатаў праз мяжу пры рэалізацыі міжнародных праектаў.

## Тэма 49. Бібліятэкі ў сістэме міжнародных культурных сувязей

Бібліятэчная сетка Рэспублікі Беларусь, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя як аснова для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне бібліятэчнай справы. Дзейнасць Міжнароднай бібліятэчнай асацыяцыі (ІФЛА) і Еўрапейскай бібліятэчнай асацыяцыі (ЕФЛА) у сістэме міжнародных кантактаў бібліятэк. Асноўныя формы супрацоўніцтва: абмен фондамі, адкрыццё фондаў для карыстання за межамі Рэспублікі Беларусь, навуковыя канферэнцыі і семінары, абмен вопытам і стажыроўкі, кніжныя выставы і інш. Магчымасці выкарыстання бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута пры арганізацыі міжнародных культурных сувязей. Выставы і прэзентацыі. Міжнародныя праекты ў галіне выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, музычнага мастацтваў. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне захавання і рэстаўрацыі кнігі. Праграма ЮНЕСКА «Памяць свету».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 50. Канцэртныя арганізацыі ў міжнародным культурным абмене

Музычнае мастацтва як адна з найбольш папулярных форм міжнародных культурных сувязей. Дзяржаўныя канцэртныя ўстановы і іх роля ў арганізацыі міжнародных праектаў. Міжнародныя музычныя фестывалі. Фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Гастролі беларускіх выканаўцаў за межамі краіны. Удзел у буйных міжнародных музычных праектах. Дарослае і дзіцячае «Еўрабачанне», «Еўрабачанне ў Вене». Дзейнасць недзяржаўных прадзюсарскіх цэнтраў і канцэртных агенцтваў па прапагандзе беларускай музычнай культуры за мяжой.

## Тэма 51. Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва ў галіне тэатральнага мастацтва

Тэатральныя фестывалі як асноўная форма міжнародных культурных сувязей у галіне тэатральнага мастацтва. Еўрапейскія тэатральныя фестывалі (Эдынбургскі, Страдфарскі, Ліонскі і інш.). Тэатральныя фестывалі ў Беларусі: «Панарама», «Белая вежа», «Тэатральны куфар» і інш. Гастролі як форма прапаганды беларускага тэатральнага мастацтва за мяжой. Гастрольная дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета РБ. Іншыя формы МКС: сумесныя пастаноўкі, запрашэнне рэжысёраў, балетмайстраў, акцёраў і інш.

## Тэма 52. Кінамастацтва ў сістэме МКС

Міжнародныя кінафестывалі: Канскі, Венецыянскі, Берлінскі і інш. Міжнародная гільдыя асацыяцый кінапрадзюсараў і членства Беларусі ў яе дзейнасці. Уручэнне кінапрэмій як форма міжнароднага супрацоўніцтва. Міжнародная дзейнасць кінастудыі «Беларусьфільм». Кінапракат як форма МКС.

## Тэма 53. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

Дзейнасць мастацкіх музеяў і галерэй па арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Выставы як асноўная форма МКС. Удзел беларускіх мастакоў у міжнародных выставах (Венецыянскае і Маскоўскае біенале). Міжнародныя праекты галерэйнага комплексу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Выставы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як частка дзён культуры Беларусі за мяжой. Фотавыставы. Пленэры як спецыфічная форма супрацоўніцтва мастакоў розных краін.

### Тэма 54. Творчыя саюзы і грамадскія арганізацыі ў сістэме МКС

Творчыя саюзы ў галіне літаратуры, музыкі, жывапісу, дызайну, архітэктуры, народных промыслаў і інш., іх міжнародная дзейнасць. Супрацоўніцтва з замежнымі творчымі саюзамі. Арганізацыя міжнародных фестываляў і іншых мерапрыемстваў сіламі творчых саюзаў. Грамадскія арганізацыі ў галіне культуры, гісторыі, краязнаўства, маладзёжныя арганізацыі ў сістэме МКС. Дзейнасць Беларускага таварыства дружбы з замежнымі краінамі. Міжнародная дзейнасць Беларускага фонду культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Канстытуцыя* Рэспублікі Беларусь. Афіцыйнае выданне. – Мінск : Беларусь, 2009. – 95 с.

*2. Гражданский* кодекс Республики Беларусь : по состоянию на 3 нояб. 2006 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2006. – 656 с.

*3. Аб дзяржаўных* мінімальных стандартах : Закон Рэсп. Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 1999. – № 89. – С. 24–27.

*4. Аб культуры* ў Рэспубліцы Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь [Новая рэд.] // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 2004. – № 87. – С. 7–22.

*5. Аванесова, Г. А.* Культурно-досуговая деятельность : Теория и практика организации / Г. А. Аванесова. – М. : Аспект Пресс, 2006. – 236 с.

*6. Ариарский, М. А.* Социально-культурная деятельность как предмет научного осмысления / М. А. Ариарский. – СПб. : Арт-студия «Концерт», 2008. – 792 с.

*7. Бабосов, Е. М.* Социология управления : учеб. пособие / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2002. – 288 с.

*8. Грыгаровіч, Я. Д.* Менеджмент у сферы культуры / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік // Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – С. 103–115.

*9. Ерасов, Б. С.* Социальные институты культуры и управление культурой / Б. С. Ерасов // Социальная культурология : учебник для студентов высш. учеб. заведений / Б. С. Ерасов. – М. : Аспект Пресс, 2000. – С. 158–172.

*10. Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

*11. Любительское* художественное творчество // Современная Беларусь : энцикл. справочник. Т. 3. Культура и искусство. – Минск : Белорус. наука, 2007. – С. 683–729.

*12. Михайлова, Л. И.* Социальное регулирование культурных процессов в обществе / Л. И. Михайлова // Социология куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры : учеб. пособие / Л. И. Михайлова. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 1999. – С. 77–89.

*13. Михеева, Н. А.* Менеджмент в социально-культурной сфере / Н. А. Михеева, Л. Н. Галенская. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 2000. – 170 с.

*14. Переверзев, М. П.* Менеджмент в сфере культуры и искусства : учеб. пособие / М. П. Переверзев, Т. В. Косцов. – М. : ИНФРА-М, 2007. – 192 с.

*15. Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент в сфере культуры : учеб. пособие / Г. Л. Тульчинский, Е. Л. Шекова. – 4-е изд. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2009. – 544 с.

*16. Чижиков, В. М.* Введение в социокультурный менеджмент / В. М. Чижиков, В. В. Чижиков. – М. : МГУКИ, 2003. – 382 с.

*Дадатковая*

*1. Палажэнне* аб клубнай установе ў РБ // Нац. реестр правовых актов РБ, 2004. – № 180. – С. 97–101.

*2. Палажэнне* аб парку культуры і адпачынку ў РБ // Нац. реестр правовых актов РБ, 2004. – № 180. – С. 105–107.

*3. Палажэнне* аб раённым (гарадскім) метадычным цэнтры народнай творчасці (культурна-асветніцкай работы) // Нац. реестр правовых актов РБ, 2004. – № 180. – С. 101–104.

*4. Положение* о театрально-зрелищной организации РБ // Нац. реестр правовых актов РБ, 2005. – № 3. – С. 131–134.

*5. Беляцкий, Н. П.* Управление персоналом : учеб. пособие / Н. П. Беляцкий, С. Е. Велесько, П. Ройш. – Минск : Книжный дом : Экоперспектива, 2005. – 352 с.

*6. Боганева, А. М.* Новыя тыпы ўстаноў культуры і клубных фарміраванняў у галіне традыцыйнай культуры / А. М. Боганева, В. А. Лабачэўская // Весн. БелІПК : навук.-метад. зб. – Мінск : БелІПК, 1999. – С. 88–103.

*7. Ігнатовіч, П. Р.* Аб’ектыўная абумоўленасць рэгулявання сферай культуры / П. Р. Ігнатовіч // Чалавек. Культура. Рынак : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 10–11 крас. 2000 г., г. Мінск / БелІПК. – Мінск, 2000. – С. 76–79.

*8. Каралёў, М. М.* Асноўныя кірункі падрыхтоўкі менеджараў сацыяльна-культурнай сферы / М. М. Каралёў // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры, 2002. – № 1. – С. 61–65.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Культурная* политика в Европе : выбор стратегии и ориентиры : сб. материалов / сост. : Е. И. Кузьмин, В. Р. Фирсов. – М. : Либерея, 2002. – 240 с.

*10. Мескон, Майкл Х.* Основы менеджмента / Майкл Х. Мескон, Майкл Альберт, Франклин Хедоури. – 3-е изд. – М. : ООО «И. Д. Вильямс», 2007. – 620 с.

*11. Никитенко, П. Г.* Ноосферная экономика и социальная политика : стратегия инновационного развития / П. Г. Никитенко. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 479 с.

*12. Саркисов, С. Э.* Менеджмент : словарь-справочник / С. Э. Саркисов. – М. : Анкил, 2005. – 808 с.

*13. Смаргович, И. Л.* Инновационные формы досуговой деятельности современной молодежи в Беларуси / И. Л. Смаргович // Павышэнне ролі клубных устаноў у сацыякультурным жыцці рэгіёнаў : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., 22–23 лістап. 2006 г., г. Мінск. – Мінск : БелДІПК, 2006. – 168 с. : іл.

*14. Степанцов, А. И.* О положении с кадрами в отрасли культуры / А. И. Степанцов // Информ. бюллетень Администрации Президента Респ. Беларусь, 2002. – № 10. – С. 77–88.

*15. Стрельцов, Ю. А.* Социокультурная деятельность и социокультурный менеджмент / Ю. А. Стрельцов // Культурология досуга : учеб. пособие. – Изд. 2-е / Ю. А. Стрельцов. – М. : МГУКИ, 2003. – С. 23–37.

16. http ://www.culturalpolicies.net

17. http ://www.kimpress.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Ацэнка і вызначэнне ўзроўню ведаў і практычных прафесійных уменняў і навыкаў (кампетэнцыя) студэнтаў ажыццяўляецца па 10-бальнай шкале, што адпавядае наступным адзнакам: 10 (дзесяць), 9 (дзевяць), 8 (восем), 7 (сем), 6 (шэсць), 5 (пяць), 4 (чатыры), 3 (тры), 2 (два), 1 (адзін).

| Балы | Паказчыкі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў і кампетэнтнасці ў межах адукацыйнага стандарту; адмова ад адказу |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту; веданне асобных літаратурных крыніц, якія рэкамендаваны вучэбнай праграмай па фундаментальнай культуралогіі, няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію культуралогіі; наяўнасць у адказе яўных лагічных памылак |
| 3 (тры) | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту; веданне часткі асноўнай літаратуры; выкладанне адказу на пытанне з істотнымі і лагічнымі памылкамі, слабае валоданне інструментарыем культуралогіі; некампетэнтнасць у вырашэнні тыпавых задач; няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках фундаментальнай культуралогіі |
| 4 (чатыры) | Дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту; засваенне зместу асноўнай літаратуры вучэбнай праграмы па фундаментальнай культуралогіі; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; лагічнае выкладанне адказу на пытанні; уменне рабіць высновы без істотных памылак; валоданне інструментарыем фундаментальнай культуралогіі, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных задач; уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка рашаць тыпавыя задачы; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па фундаментальнай культуралогіі і даваць ім ацэнку |
| 5 (пяць) | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; граматнае, лагічнае, правільнае выкладанне адказу на пытанні; уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем фундаментальнай культуралогіі, уменне яго |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках фундаментальнай культуралогіі і даваць ім параўнальную ацэнку |
| 6 (шэсць) | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем фундаментальнай культуралогіі, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне культуралагічным інструментарыем, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках культуралогіі і даваць ім аналітычную ацэнку |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне культуралагічным інструментарыем (у тым ліку тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | прафесійных задач; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах навучальнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай; уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па культуралогіі і даваць ім аналітычную ацэнку |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні; валоданне культуралагічным інструментарыем, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па культуралогіі і даваць ім аналітычную ацэнку |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні; бездакорнае валоданне культуралагічным інструментарыем, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па культуралогіі; уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па фундаментальнай культуралогіі і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін; творчая самастойная праца на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ТЭОРЫЯ, ГІСТОРЫЯ І ПРАКТЫКА МІЖНАРОДНЫХ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ**

*Праграма дзяржаўнага экзамену па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), спецыялізацыі 1-21 04 01-02 02 Менеджмент міжнародных культурных сувязей*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,68. Ул.-выд. арк. 1,52. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ